Сычова, І.С. Рэгіянальная мадэль выхавання асобы ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся / І.С. Сычова // Адукацыя і выхаванне: навукова-тэарэтычны і інфармацыйна-метадычны часопіс. – 2011. – № 2. – С. 59–66.

# Рэгіянальная мадэль выхавання асобы ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся

І.С.Сычова (УА МДПУ імя І.П.Шамякіна)

У артыкуле прадстаўлена і абгрунтавана рэгіянальная мадэль выхавання. Адлюстраваны наступныя сістэмаўтваральныя кампаненты народнай педагогікі Мазырскага Палесся: умовы нараджэння ідэальнага, здаровага дзіцяці; узроставыя перыяды развіцця дзіцяці; фактары развіцця асобы; сутнасць выхавання на Мазырскім Палессі; змест выхавання; прынцыпы выхавання; метады выхавання; традыцыйныя формы выхавання; сродкі народнага выхавання; ідэал і мэта выхавання. Характар іх змястоўнага напаўнення і ўзаемадзеяння раскрывае спецыфіку рэгіянальнай выхаваўчай практыкі.

Мазырскае Палессе – гэта тэрыторыя, якая лакалізуецца на ўзбярэжжы Прыпяці, вакол г. Мазыра і ўключае Петрыкаўскі, Жыткавіцкі, Брагінскі, Мазырскі, Калінкавіцкі, Хойніцкі, Лельчыцкі, Нараўлянскі і Ельскі раёны. На працягу стагоддзяў беларусамі-палешукамі была сфарміравана самабытная традыцыйная культура, важнейшым аспектам якой з’яўляецца педагагічны. Народная педагогіка Мазырскага Палесся – састаўная частка традыцыйнай народнай культуры, сукупнасць эмпірычных ведаў і вопыту практычнай арганізацыі выхавання, якія склаліся і перадаюцца ў побыце, традыцыях, народнай творчасці, міжасабовых зносінах прадстаўнікоў розных пакаленняў ва ўмовах дадзенага рэгіёна.

З мэтай аналізу і абагульнення рэгіянальнага выхаваўчага вопыту распрацавана мадэль выхавання асобы ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся, якая дэманструе эфектыўнасць і ўзаемаўзгодненасць усіх асноўных кампанентаў народнага выхавання. Мадэль адлюстроўвае канцэпцыю народнай педагогікі Мазырскага Палесся – рэгіянальна адметную сістэму поглядаў на выхаванне, якая перадавалася вусна з пакалення ў пакаленне.

**Умовы нараджэння ідэальнага, здаровага дзіцяці**

У рэгіянальнай выхаваўчай традыцыі даволі выразна акрэслены ўмовы нараджэння ідэальнага, здаровага дзіцяці – “*як кроў з малаком*” [3, 426].

Па-першае, каб дзіця нарадзілася здаровым і разумным, каб яму спрыяла ўдача, бацькі, блізкія і асабліва маці ў перыяд цяжарнасці (пачынаючы ад вяселля і пакуль дзіцяці не споўніцца год) павінны прытрымлівацца сістэмы рэгіянальных забарон і рытуалаў. Вылучаюцца наступныя дзеянні, важныя для фарміравання асобы дзіцяці ў будучым: паводзіны цяжарнай жанчыны і адносіны да яе акружаючых; абставіны пры нараджэнні; працэс адразання пупавіны і дзеянні з

дзіцячым месцам; першае купанне нованароджанага; выбар імя; адведкі; радзіны; хрэсьбіны. Адхіленні ў развіцці дзяцей тлумачацца недастатковым клопатам аб здаровым патомстве пры стварэнні сям'і (парушэнне народных звычаяў і маральных норм), няўвазе да ўнутрыўтробнага жыцця, уздзеяннем шкоднай магіі, іншымі як рацыянальнымі, так і ірацыянальнымі прычынамі. Такім чынам, абапіраючыся на рэгіянальную сістэму забарон, народная педагогіка Мазырскага Палесся ставіць за мэту садзейнічаць фарміраванню здаровага, псіхічна і фізічна дасканалага дзіцяці на самых ранніх этапах развіцця, яшчэ ва ўлонні маці.

Па-другое, пажадана, каб маладыя бацькі былі здаровымі, мелі добрую спадчыннасць і адпаведны мясцовым умовам менталітэт, каб дзіця не наследавала псіхічных або фізічных недахопаў і адмоўных рыс характару. Асноўнай дэтэрмінантай развіцця ў рэгіянальнай выхаваўчай традыцыі прызнаецца спадчыннаць: “*Па роду і куры чубатыя*” [2, с. 128]. Дзіцяці жадаюць вырасці як дзед, як бацька, або быць як маці, бабуля, так свядома або несвядома менталітэт перадаецца дзецям і ўнукам. Сапраўдны паляшук (*здаровы як дуб*, *працавіты як мурашка*, *цягавіты як вол* і інш.) павінен быць падрыхтаваны сістэмай народнага выхавання да пераадолення практычна любых жыццёвых выпрабаванняў.

Па-трэцяе, істотны род, сям'я, слава роду з бацькоўскага і мацярынскага бакоў. Паводле ўстойлівых перакананняў, дзіця можа “*удацца*” (нарадзіцца падобным знешне або па характару, схільнасцях) не толькі непасрэдна на сваіх бацькоў, але і на больш аддаленых продкаў. Іх грахі ці адсутнасць благаславення шлюбу з таго або іншага боку будуць “*засіціць сцежку*”, жыццёвы шлях дзіцяці. Такім чынам, працяг роду – гэта не толькі фізіялагічны працэс, але перадача і далейшае наследаванне духоўнага вопыту роду, сям'і.

Па-чацвёртае, пажадана нарадзіцца ў добрую гадзіну, спрыяльны прыродны час адпаведна рэгіянальнаму календару. Паводле уяўленняў беларусаў-палешукоў, зачацце, нараджэнне, развіццё і выхаванне чалавека, яго псіхіка, разумовыя і творчыя здольнасці падпарадкоўваюцца агульным касмічным законам, залежаць ад асяроддзевых, прыродных фактараў. Добрай прыкметай з'яўляецца нарадзіцца на маладзіку, пад поўню, неспрыяльнай – на сходніх днях. Лічыцца, што дзеці, якія нараджаюцца ўзімку – кволыя, але старанныя і добрыя работнікі; маёвыя дзеці – нешчаслівыя, але з іх бываюць добрыя музыкі і певуны; улетку – нараджаюцца гарачыя і сярдзітыя, але адыходлівыя людзі; па восені – заможныя і гаспадарлівыя [4, с. 173-174]. Тэрміны і прыкметы вар'іруюцца, але паўсямесна прызнаецца той факт, што час сутак, дзень тыдня, фаза месяца, пара года, калі нарадзіўся чалавек, вызначаюць яго характар, далейшы жыццёвы шлях.

**Узроставыя перыяды развіцця дзіцяці**

Працэс народнага выхавання (рэалізацыя зместу і прынцыпаў, выбар метадаў, сродкаў і форм) істотна залежыць ад узросту выхаванца. Беларусы-палешукі не

прытрымліваліся строгай узроставай перыядызацыі дзяцей, часцей вызначалі ўзрост адпаведна выконваемай працоўнай дзейнасці (нянька, пастух, аратай) або сацыяльнаму статусу (жаніх, нявеста). Узроставыя ступені дзяцінства вылучаюцца толькі прыблізна: "*большуха – дзяўчына-падлетак*"; "*хлопчак – хлопчык-падлетак*" [1].

На аснове апытвання мясцовых жыхароў і аналізу навуковых крыніц у народнай педагогіцы Мазырскага Палесся мэтазгодна вылучыць наступныя ўзроставыя перыяды: *перыяд унутрыўтробнага развіцця і нованароджанасці* (першы этап: ад зачацця да 40 дзён; другі этап: ад 40 дзён да 1 года); *перыяд маленства, кармлення грудзьмі* (ад нараджэння да 1-3 гадоў); *перыяд дзяцінства* (3-9); *падлеткавы ўзрост* (10–14); *маладосць, маладыя гады* (15-20).

Першы з названых перыядаў вызначае адметнасць рэгіянальнай выхаваўчай культуры, у якой найбольш адказным лічыцца перыяд унутрыўтробнага развіцця дзіцяці і нованароджанасці. Менавіта ў першыя 40 дзён стараюцца пахрысціць дзіця, даць імя, да гэтага часу да нованароджанага адносяцца з вялікай асцярогай, не паказваюць чужым і не называюць выбранае імя пасля заходу сонца, у размове не ўказваюць на пол, а называюць словам ніякага роду – "*дзіця*". Перыяд кармлення грудзьмі, непасрэднага кантакту з самым блізкім чалавекам, па словах інфарматараў, звычайна працягваўся да года, але нярэдка – і да 2-3 гадоў. Падлеткавы ўзрост, у залежнасці ад полу дзіцяці, можа быць названы перыядам мужчынскага, бацькоўскага выхавання для хлопчыкаў або жаночага, мацярынскага выхавання – для дзяўчынак. Маладыя гады – час, калі дзеўкі і хлопцы хадзілі на вячоркі, шукалі сабе пары. Поўны выхаваўчы цыкл у народнай педагогіцы Мазырскага Палесся – гэта жыццё чалавека ад нараджэння да смерці – век, свой век.

**Фактары развіцця асобы**

Развіццё асобы ў традыцыйнай культуры адбываецца на працягу ўсяго жыцця і залежыць як ад *унутраных* і *знешніх* фактараў, так і ад *ірацыянальных,* неспазнаных чалавекам. *Унутраныя фактары* – гэта спадчыннасць, прыроджаныя індывідуальныя якасці і пол выхаванца; асабістая актыўнасць асобы і глыбіня эмацыянальных перажыванняў; *знешнія фактары* – веды, уменні і навыкі, набытыя ў ходзе навучання і мэтанакіраванай перадачы рэгіянальнага жыццёва-практычнага вопыту; асабісты вопыт, атрыманы ў працэсе сацыялізацыі, ускоснага ўздзеяння мясцовага побыту і роднай прыроды; *ірацыянальныя фактары* – лёс ("*планіда*"), доля (нядоля), шчасце ("*талан*") або іх адсутнасць: "*Доля добрая, та й жытка добрая*" [4, с. 283].

Доля і нядоля – важнейшыя катэгорыі народнай культуры, у якіх асэнсоўваецца індывідуальны лёс як частка цэлага, агульнага для роду, сям'і, соцыуму шчасця [5, с. 113]. Па народных уяўленнях, магчымыя варыянты развіцця падзей запраграмаваны лёсам і доляй: "*кожын чалавек ці рано, ці позно мае тое*

*перажыць, што яму назначано*” [4, с. 64], хаця і могуць быць пэўным чынам скарэкціраваны ў ходзе абрадаў. Таму просьба аб шчаслівай долі нованароджанага – стрыжнёвая ідэя радзіннага абраду, аб сямейным шчасці – вясельнага і г.д.

Доля нованароджанага ўяўляецца ў выглядзе прыгожай дзяўчыны: “Адна спляла вянок з асату да з чатрапалоху да й кажэ: “*Ось, такая жытка будзе таго чалавека, якого я буду доля”. – Другая спляла вянок з калітак да з веццяı. А я ж, – кажэ, – доля рыбака да ахвотніка. – Трэйцяя ж самая гожая спляла сабе вянок з каласоў жыта й пшаніцы да й убрала яго рознымі кветкамі. –Я ж, – кажэ, – доля гаспадара*” [4, 284].

Беларусы-палешукі вераць, што выпадковасць, добрая або ліхая гадзіна, прысутнасць або адсутнасць шанцавання, спрыяльныя або неспрыяльныя падзеі сямейнага жыцця акзваюць значны ўплыў на лёс чалавека: “*такі мой талан”* [1, с. 132]). Падобна казачнаму герою, кожны чалавек штодня знаходзіцца на раздарожжы, перад выбарам, што асабліва актуальна ў лёсавызначальныя моманты жыцця: выбар мужа або жонкі, прафесіі і інш. І нават, калі знешнія і ўнутраныя фактары спрыяюць развіццю асобы, але доля ліхая, то чалавек можа зрабіць памылковы выбар, трапіць у цяжкую сітуацыю.

У этнапедагагічных даследаваннях названыя ірацыянальныя фактары асобна не вылучаліся, але ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся, яны, безумоўна, улічваюцца, адлюстраваны ў народнай творчасці. На ірацыянальныя фактары чалавек імкнуўся аказваць пэўны ўплыў, але і гэтыя фактары вызначалі якім народзіцца дзіця, ці зможа ў поўнай меры рэалізаваць свой жыццёвы патэнцыял.

**Змест выхавання**

Змест народнага выхавання – гэта сацыяльны вопыт папярэдніх пакаленняў (жыццёвая філасофія палешукоў, сістэма ведаў, практычных уменняў і навыкаў, устойлівых звычак паводзін, грамадскія і сямейна-побытавыя традыцыі), якім павінен авалодаць выхаванец.

На Мазырскім Палессі выразна выяўляецца полаўзроставая дыферэнцыяцыя зместу выхавання, дзе, па-сутнасці, рэалізуюцца два асобныя працэсы: выхаванне хлопчыка, будучага мужчыны і выхаванне дзяўчынкі, будучай жанчыны. Працэсы ўзаемазвязаны, але не змешваюцца паміж сабой, што абумоўлена мясцовымі забаронамі, характарам традыцыйнай культуры і спецыфікай побытава-гаспадарчай дзейнасці. Парушэнне забарон магло прывесці да непажаданых наступстваў: з’яўленню фізічных (грудзі ў мужчын, барада ў жанчын) або псіхічных (страх, трывога, баязлівасць, нерашучасць у мужчын; змена голасу і паводзін у жанчын) прыкмет, уласцівых супрацьлегламу полу.

У аснове зместу выхавання знаходзяцца народны светапогляд і традыцыйная мараль, што вызначаюць узаемаадносіны паміж бацькамі і дзецьмі, стаўленне чалавека да жывой і нежывой прыроды і інш. Змест народнага выхавання

ўтрымлівае наступныя кампаненты: *маральнае выхаванне* – падмурак народнай педагогікі Мазырскага Палесся, абапіраецца на паняцці “грэх”, “сорам”, “праўда” і “крыўда”, як аснову ўнутранай, глыбокай духоўнасці; *разумовае выхаванне* – праяўленне клопату аб нараджэнні разумных, псіхічна здаровых дзяцей, развіцці памяці і мыслення выхаванцаў сродкамі народнай педагогікі; *працоўнае выхаванне* – развіццё асобы ў дзейнасці, фарміраванне станоўчых адносін да любой працы, грамадскае асуджэнне гультайства; *фізічнае выхаванне* – загартоўка арганізма ў натуральных умовах, насычанасць побыту фізічнымі нагрузкамі, разуменне адзінства духоўнага і фізічнага здароўя членаў роду, сям’і; *экалагічнае выхаванне* – засваенне рэгіянальнага народнага календара, спосабаў прыродакарыстальніцкай дзейнасці, фарміраванне пераканання ў непазбежнасці пакарання за няправільныя адносіны да прыроды; *эстэтычнае выхаванне* – эстэтычна-мастацкае і эстэтычна-працоўнае развіццё асобы, фарміраванне веры ў стваральную, выхаваўчую сілу народнага мастацтва.

**Сутнасць выхавання на Мазырскім Палессі**

На рэалізацыю зместу і выбар метадаў выхавання істотна ўздзейнічае разуменне сутнасці выхавання на Мазырскім Палессі. Змястоўнае напаўненне тэрміну “выхаванне” у народнай педагогіцы Мазырскага Палесся адрозніваецца ад агульнапрынятага. Лексема “выхаванне” практычна не ўжываецца ў народных гаворках, дзе выхаваўчае ўзаемадзеянне вызначаецца як “гадаваць”, “глядзець”, “слухаць” – “не слухаць” і інш. [1]; [4]. *Народнае выхаванне* – сістэма арганізацыі гадавання, навучання, нагляду, дзе *гадаванне* – забеспячэнне фізічнага і духоўнага развіцця дзяцей у сям’і да паўналецця, уступлення ў шлюб; *навучанне* – працэс набыцця жыццёва-практычнага вопыту і рэгіянальнага светапогляду ў сям’і, сацыяльным асяроддзі; *нагляд* – кантроль і ацэнка штодзённых паводзін, учынкаў і выказванняў выхаванца ў сям’і або соцыуме ў адпаведнасці з патрабаваннямі народнай маралі.

**Прынцыпы выхавання**

Прынцыпы народнага выхавання з’яўляюцца цэнтральным, звязуючым звяном прапануемай мадэлі. Гэта патрабаванні да выхаваўчай дзейнасці, якія забяспечваюць эфектыўнасць фарміравання асобы на аснове рэгіянальнай культуры і вынікаюць з агульных, устойлівых і паўтараемых заканамернасцей, характэрных для традыцыйнага ладу жыцця. Да агульных, глыбінных заканамернасцей у шырокім сэнсе адносяцца: а) узаемасувязь чалавека і прыроды, сусвету; б) цыклічнасць прыроднага, гаспадарчага і сацыяльнага быцця і фальклору; в) жыццё ў працы, натуральны характар гаспадаркі; г) пераемнасць традыцый, кансерватызм, культ продкаў; д) адзінства духоўнага і матэрыяльнага, рацыянальнага і ірацыянальнага ў жыцці.

Вылучаны наступныя прынцыпы выхавання:

– *прынцып прыродазгоднасці* – патрабаванне ўспрыняцця і цэласнага выхавання чалавека як неад'емнай часткі прыроды, адпаведна часу нараджэння, генатыпу, полу і ўзросту з улікам індывідуальных псіхалагічных асаблівасцей, паступовага фізічнага і духоўнага развіцця на ўлонні роднай прыроды;

– *прынцып цыклічнасці* – патрабаванне паступовага, сістэматычнага характару выхаваўчага ўздзеяння, адпаведна ўзроставым перыядам развіцця дзіцяці, якія падпарадкаваны кругазвароту, цыклічнасці быцця (прыроднай, астранамічна-часавай, сельскагаспадарчай, мастацкай, рэлігійна-побытавай, жыццёва-біялагічнай, сямейна-родавай, сацыяльнай і інш.), што заснавана на пэўным рытме і забяспечвае ўпарадкаванасць існавання прыроды, чалавека і традыцыйнага грамадства;

– *прынцып сувязі выхавання з працай* – патрабаванне ранняга працоўнага развіцця адпаведна полу дзіцяці ва ўмовах натуральнай гаспадаркі і трывалых сямейна-родавых сувязей, практычнага далучэння дзяцей да асноўных працоўных заняткаў мясцовага насельніцтва;

– *прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага ў выхаванні* – патрабаванне ўліку ўздзеяння на псіхічнае і фізічнае развіццё дзіцяці не толькі канкрэтнага слова або дзеяння, але і спраў продкаў, сілы думкі, пажадання, погляду, характару ўзаемадзеяння прадметаў матэрыяльнай і з'яў духоўнай культуры ў лёсавызначальныя моманты жыцця;

– *прынцып культуразгоднасці* – патрабаванне выхавання дзіцяці як спадкаемцы традыцый (рэлігійных, маральных працоўных, эстэтычных, сямейных, сацыяльных, побытавых) свайго роду, сям'і і рэгіёна, носьбіта мясцовай гаворкі і светапогляду (адметнае ўспрыняцце часу, прасторы, прыроды), што забяспечвае пераемнасць пакаленняў.

**Метады выхавання**

На прынцыпах грунтуюцца метады народнай педагогікі Мазырскага Палесся. Метад выхавання разумеецца як спосаб вырашэння выхаваўчых задач і ажыццяўлення мэтанакіраванага або ўскоснага выхаваўчага ўзаемадзеяння.

У рэгіянальнай выхаваўчай практыцы склаліся наступныя ўзаемадапаўняльныя групы метадаў выхавання:

– *метады выхавання словам, вербальныя* (перакананне, павучанне, павучанне ў мастацкай форме, ускоснае тлумачэнне, папярэджанне, заахвочванне, гутарка, ускосная гутарка, станоўчая і адмоўная грамадская ацэнка, забарона, асуджэнне, дражненне, высмейванне, абзыванне і г.д.);

– *практычныя метады і прыёмы* (назіранне, паўтарэнне, практыкаванне, прывучэнне, заданні, даручэнні, аўтарытэт бацькоў і старэйшых, станоўчы і адмоўны прыклад, прыклад продкаў, прыклад-ідэал, індывідуальнае і групавое спаборніцтва, выпрабаванне розуму, практычныя выпрабаванні і г.д.);

– *метады і прыёмы эмацыянальна-магічнага ўздзеяння* (запалохванне, пагроза і папярэджанне, прыём нямой пагрозы, фізічнае пакаранне з элементамі эмацыянальна-магічнага ўздзеяння, пераключэнне ўвагі, адухаўленне нежывых прадметаў, блаславенне і адрачэнне, праклён, пакаянне, прысяганне, ахвяраванне, гасцінцы, валачобнае, добрыя пажаданні, павер'і і г.д.).

Вылучэнне метадаў эмацыянальна-магічнага ўздзеяння ў асобную групу выклікана іх спецыфікай: дадзеныя метады абапіраюцца на вышэй абгрунтаваны рэгіянальны прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага, у выніку чаго пры ўздзеянні на асобу ўжываюцца не толькі слова або дзеянне, а ў спалучэнні з міфалагічнымі і рэлігійнымі вобразамі, элементамі сугестыі, унушэння.

Выбар канкрэтных метадаў вызначаўся ўзростам і полам дзяцей, іх індывідуальнымі асаблівасцямі і задачамі выхавання на пэўным этапе.

**Традыцыйныя формы выхавання**

Традыцыйныя, спецыяльна арганізаваныя формы выхавання і сацыялізацыі асобы падраздзяляюцца па наступных прыкметах:

– *па колькасці ўдзельнікаў*: індывідуальныя, мікрагрупавыя, групавыя (калектыўныя) і масавыя;

– *па ўзроставаму складу:* аднаўзроставыя, рознаўзроставыя і шматпакаленныя;

– *па палавой прыкмеце:* хлапечыя, дзявочыя або змешаныя;

– *адпаведна цыклічнасці фальклору*: формы выхавання, абумоўленыя цыклам сямейна-бытавых звычаяў і абрадаў (радзіны, вяселле); формы выхавання, абумоўленыя цыклам каляндарна-земляробчых звычаяў і абрадаў (зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія).

У комплексе традыцыйныя формы выхавання садзейнічаюць эфектыўнай арганізацыі вольнага часу і міжасабовых зносін. У іх праяўляецца рэгіянальная адметнасць народнай педагогікі: большасць народных святаў і абрадаў распаўсюджаны па ўсёй Беларусі, але тым не менш яны істотна адрозніваюцца дэталямі, полаўзроставым складам удзельнікаў, непаўторнасцю мясцовых дыялектаў.

**Сродкі народнага выхавання**

У якасці сродкаў выхавання выступае духоўная і матэрыяльная культура беларусаў-палешукоў, прадстаўленая ў сукупнасці, без дэталізацыі вуснай народнай творчасці, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш. Асобна вылучана родная прырода, паколькі яна не створана чалавекам, але з'яўляецца асновай яго існавання, загартоўвае фізічна і духоўна. Праца і працоўныя заняткі мясцовага насельніцтва знаходзяцца ў кантэксце як матэрыяльнай, так і духоўнай культуры, але, па-сутнасці, уяўляюць сабой асобны, самастойны феномен народнага выхавання, школу жыцця, якая рыхтавала чалавека да пераадолення практычна любых

жыццёвых выпрабаванняў. У адзінстве сродкі народнага выхавання ўяўляюць агульнае цэлае, з'яўляюцца састаўнымі складаемымі цэласнай народна-выхаваўчай сістэмы.

**Ідэал і мэта выхавання**

*Народны выхаваўчы ідэал* – гэта дасканалая асоба (ідэальнае дзіця, ідэальны хлопец ці дзяўчына) ва ўяўленні беларусаў-палешукоў, што валодае як прыроджанымі, перададзенымі "па раду", так і набытымі ў ходзе сацыялізацыі або мэтанакіравана сфарміраванымі ў працэсе сямейнага і грамадскага выхавання фізічнымі і духоўнымі якасцямі.

Патрабаванні да дасканалай асобы прадстаўлены ў народнай творчасці (казкі, прыказкі), у радзінна-хрысцінным (уяўленні аб ідэальным дзіцяці) і вясельным абрадах (ідэал хлопца і дзяўчыны), а рэальна дасягнуты вынік выхавання ўвасоблены ў канкрэтных асобах жаніха і нявесты – маладой і маладога. Пры гэтым характэрна прысутнасць не толькі індывідуальнай, але і калектыўнай ацэнкі (славы) роду і сям'і – сукупнасці ідэальных якасцей прадстаўнікоў дадзенага рэгіёна.

*Мэта народнага выхавання* – шматбаковае развіццё дзіцяці на аснове рэгіянальнай культуры, у выніку чаго адбываецца выхаванне дасканалай асобы ў адпаведнасці з традыцыйнымі ўяўленнямі беларусаў-палешукоў: дасканалага хлопца, будучага мужчыны або дасканалай дзяўчыны, жанчыны. Ажыццяўляецца падрыхтоўка да жыцця і асноўных сацыяльных роляў: паслухмянага, клапатлівага сына або дачкі; добрага сем'яніна, мужа або жонкі, бацькі або маці; сумленнага працаўніка, які забяспечвае дабрабыт сям'і і здольны пераадольваць жыццёвыя выпрабаванні; надзейнага члена сельскага калектыву, які захоўвае спрадвечныя традыцыі. Такім чынам, народны выхаваўчы ідэал знаходзіць увасабленне ў рэальных асобах, адпаведна полу выхаванца і менталітэту беларусаў-палешукоў.

У агульных рысах паляшук і сёння свядома або несвядома з'яўляецца носьбітам наступных рыс і якасцей: сціплы, эмацыянальна стрыманы ў выказванні асабістых перажыванняў і чулы, "жаласлівы" да чужой бяды; сумленны, справядлівы і прынцыповы, але асцярожны ў выказваннях, умее трымаць язык за зубамі, неахвотна і не адразу адкрывае душу чужому чалавеку; камунікабельны, але не любіць пустой балбатні; разумны і кемлівы, але не дэманструе гэта адкрыта, часцей "сабе на ўме" і выглядае прастачком; крытычна адносіцца да ўсяго новага, шануе славу свайго роду і імкнецца хоць у нечым жыць як жылі дзяды і прадзеды; калі і не ўжывае, то добра ведае сваю гаворку і мясцовыя мянушкі, па якіх беспамылкова адрознівае сваіх ад чужых; любіць сваё селішча, акружаючую прыроду і без дэкларацый даказвае гэта, бо здольны жыць у родных мясцінах нават пасля Чарнобыля; як правіла добра арыентуецца ў прасторы, не заблудзіцца ў лесе і не патоне ў балоце; цярплівы і настойлівы, працуе самааддана ў любой сферы, але цэніць працу найперш сялянскую, фізічную; на генетычным узроўні любіць зямлю і

пакутуе ад адсутнасці кантакту з прыродай, таму нярэдка мае прысядзібны ўчастак, збірае або вырошчвае грыбы і ягады; ведае цану здароўю, але па прычыне апантанасці працай або ідэяй не беражэ сябе, у глыбіні душы не давярае дактарам і крытычна ставіцца да фізкультуры, лечыцца пераважна па сямейных, народных рэцэптах або ў мясцовай бабкі-шаптухі; даволі рэлігійны, баіцца граху, але пры гэтым шчыра верыць у сны, варажбу, прывідаў, кантакты з нябожчыкамі, рыхтуецца да смерці ўласнай або блізкіх і трымае дома вузельчык на смерць ці нават труну на гарышчы; любіць жыццё і лічыць самагубства вялікім грахом, клапоціцца не толькі пра сябе, але і пра блізкіх, сее жыта, хоць збіраецца паміраць; цэніць матэрыяльны дастатак, ашчаджае кожную капейку, імкнецца назапасіць і на вяселле, і на смерць, і на чорны дзень, каб не ісці ў позычкі; не давярае зробленаму або прыгатаванаму чужымі рукамі, па меры магчымасці пячэ свой хлеб, гатуе дамашнія стравы і, пeражыўшы не адну галадоўку, мае схільнасць рабіць харчовыя запасы; любіць і разумее малых дзяцей і надзвычай прымхлівы ў адносінах да іх псіхалагічнага і фізічнага здароўя; патрабавальна адносіцца да падрослых чужых і ўласных дзяцей, рэдка гаворыць аб любві да блізкіх, але здольны дапамагаць ім да апошняга і нават аддаць за іх жыццё. Спалучэнне дадзеных ментальных уласцівасцей дазваляе мясцовым жыхарам не толькі выжыць, але і стварыць сям’ю, эфектыўна працаваць і духоўна развівацца ва ўмовах дадзенага рэгіёна, на роднай зямлі.

Мадэль паказвае, што на Мазырскім Палессі існавала дастаткова стройная, самаарганізаваная сістэма поглядаў на выхаванне асобы, якая абапіралася на інтуіцыю, жыццёва-практычны вопыт і пачуццё меры. Рэгіянальныя падыходы да выхавання асобы па сваёй сутнасці некалькі адрозніваліся ад агульнапрынятых у сучаснай педагагічнай навуцы, але давалі станоўчы выхаваўчы эфект і ў цэлым развівалася ў агульным рэчышчы выхаваўчых прыярытэтаў беларускай народнай педагогікі, адлюстроўваючы спецыфіку менталітэту і светапогляду беларусаў-палешукоў. Пры гэтым базавыя этнічныя каштоўнасці, да якіх адносяцца народная мараль, асаблівасці сацыялізацыі асобы, разуменне чалавека, светапогляд у цэлым, увасобленыя ў сістэме народнай педагогікі, не толькі захоўваюцца, але маюць тэндэнцыю да выкарыстання ў новых умовах, па-за межамі традыцыйнай культуры.

**Літаратура**


1. Кучук, І.М. Палескі слоўнік: Лельчыцкі раён / І.М. Кучук, А.К. Малюк. – Мазыр: МазДПІ імя Н.К. Крупскай, 2000. – 156 с.
2. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.
3. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Чеслаў Пяткевіч; уклад., прадм. У. Васілевіча; пер. з пол. Л.Салавей і У.Васілевіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.
4. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; навук. рэд., прадм. У.К. Касько. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
5. Славянские древности: этнолингвистический словарь: в 5 т. / Ин-т славяноведения и

балканистики РАН; под общей ред. Н.И. Толстого. – Москва: Междунар. отношения, 1999. – Т. 2: Д-К (Крошки). – 704 с.